**Каваленя Аляксандр Аляксандравіч**
*Нацыянальная акадэмія навук Беларусі (Мінск, Беларусь)*

# КАСТРЫЧНІК 1917 ГОДА Ў ЛЁСЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

## Шаноўны Максім Уладзіміравіч!
## Паважаныя ўдзельнікі навуковага форуму!

Ад імя вучоных Адзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прыміце самыя цёплыя словы віншаванняў з нагоды правядзення нашага навуковага форуму. Не магу не адзначыць, што 2017 год абвешчаны ў нашай дзяржаве Годам навукі. Гэта не выпадковая, а даволі сімвалічная падзея. У гэтым годзе вучоныя і грамадскасць нашай краіны адзначалі шэраг лёсавызначальных дат у гісторыі беларускага народа. Нагадаю 1155-годдзе Полацка — калыскі беларускай дзяржаўнасці, 950-годдзе Мінска, 500-годдзе кнігадрукавання, 135 гадоў з дня нараджэння вялікіх песняроў беларускага народа, класікаў нацыянальнай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, 130 гадоў з дня нараджэння Цішкі Гартнага, пісьменніка і дзяржаўнага дзеяча, 100-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі, 100-годдзе Першага Усебеларускага з’еда, на якім упершыню ў гісторыі было абвешчана права беларускага народа на самавызначэнне.

Вельмі сімвалічна, што праз сто гадоў навуковая супольнасць сабралася ў той жа зале, дзе праходзілі вострыя дэбаты дэлегатаў Першага Усебеларускага з’езда, каб яшчэ раз навукова асэнсаваць гістарычны выбар тых, хто імкнуўся на практыцы рэалізаваць адвечную мару беларусаў — людзмі звацца.

Сёння навуковая грамадскасць упэўнена крочыць насустрач II З’езду вучоных Беларусі. Разам з вучонымі з ВНУ мы арганізавалі і правялі ў 2017 г. больш за 60 навукова-арганізацыйных мерапрыемстваў. Значны рэзананс шырокай грамадскасці выклікалі міжнародныя канферэнцыі «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 950-годдзя горада)», «Полацкія чытанні — 2017» у межах святкавання Дня беларускага пісьменства, Другі беларуска-кітайскі гуманітарны навуковы форум «Праблемы спалучэння Эканамічнага пояса Шаўковага шляху і Еўразійскага эканамічнага саюза», «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў», Першы беларускі філасофскі кангрэс «Нацыянальная філасофія ў глабальным свеце», «Сучасныя праблемы лексікаграфіі».

Нагадаю, што з 2016 года паспяхова выконваецца дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства». Толькі за 2016 і першую палову 2017 г. яе выканання апублікавана звыш 7500 навуковых прац, з іх больш за 1000 — у замежных навуковых выданнях. Падрыхтавана і выдадзена 586 кніжных выданняў, у тым ліку 170 манаграфій, 51 даведнік і энцыклапедыя, звыш 100 зборнікаў навуковых прац.

Патрэбна адзначыць, што нашы фундаментальныя выданні — гэта важнейшая аснова арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэса ў школах і ВНУ нашай краіны. На аснове навуковых вынікаў падрыхтавана каля 200 падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, вучэбных карт і атласаў.

## Шаноўныя калегі!

У выступленні Ігара Аляксандравіча ўжо прагучалі некаторыя ацэнкі значэння рэвалюцыйных падзей, якія адбыліся ў Расіі ў 1917 г. Адзначу, што

сапраўды пасля развалу Савецкага Саюза значна пашырыўся дыскурс асэнсавання падзей рэвалюцыі. Да гэтага часу не сціхаюць дыскусіі, многія з якіх маюць на мэце не столькі высветліць праўду, колькі даказаць правільнасць або памылковасць і нават злачыннасць выбранага шляху грамадскага развіцця Расіі, абвешчанага лідарамі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Патрэбна нагадаць той факт, што айчынныя даследчыкі за час суверэннага развіцця шмат зрабілі дзеля аб'ектыўнай рэканструкцыі падзей станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Назаву імёны М. Біча, У. Ладысева, П. Петрыкава, І. Ігнаценкі, Р. Платонава, М. Сташкевіча, У. Міхнюка, У. Круталевіча. На жаль, гэтыя тытаны адышлі ад нас, іх справу сёння працягваюць М. Касцюк, У. Коршук, У. Казлякоў, С. Рудовіч, М. Смяховіч, В. Мазец. Менавіта дзякуючы іх працам крок за крокам адраджаліся могія супярэчлівыя падзеі станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Зроблена шмат. Дастаткова назваць выхад «Нарысаў гісторыі Беларусі», шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», двухтомніка «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», у якіх зроблена грунтоўная праца навуковага асэнсавання гісторыі дзяржаўнасці. Тым не менш наперадзе яшчэ шмат працы па навуковым асвятленні многіх старонак гісторыі беларускага народа. Сённяшняя канферэнцыя якраз і заклікае да пошуку і паглыбленага асэнсавання лёсаноснага этапа нацыянальнай гісторыі.

Хачу звярнуць увагу, асабліва маладога пакалення, што больш за 70 гадоў народы Савецкага Саюза адзначалі 7 лістапада як дзяржаўнае свята. Гэта быў не проста «чырвоны дзень календара», а галоўнае свята краіны, якой ужо няма. Падабаецца гэта ці не, але мільёны грамадзян вялікай дзяржавы ў трох пакаленнях большую частку XX стагоддзя святкавалі Дзень Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі як свята сацыяльнага вызвалення, сацыяльнай і нацыянальнай роўнасці. Думаю, што да гэтага выбару неабходна ставіцца не толькі з разуменнем, але і з павагай.

У кантэксце заяўленай тэмы нашага навуковага форуму патрэбна адзначыць, што рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. у Расіі, адкрылі шырокія магчымасці для рэалізацыі нацыянальнага самавызначэння многіх краін, у тым ліку і Беларусі.

Агульнавядома, што бальшавікі, захапіўшы ўладу, пачалі на практыцы рэалізоўваць ідэі, якія абвясцілі лідары Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у галіне нацыянальна-дзяржаўнай пабудовы краіны. Так, у чэрвені 1917 г. Першы з'езд Саветаў абвясціў дэкларацыю правоў народаў Расіі, а Другі з'езд Саветаў у лістападзе пацвердзіў яе [1, с. 39—41].

Ужо 15 лістапада 1917 г. Савет Народных Камісараў прыняў Дэкларацыю правоў народаў Расіі — адзін з першых законаў савецкай улады, падпісаных І. Сталіным і У. Леніным. У ёй падкрэслівалася:

«1) Равенство и суверенность народов России.

2) Право народов России на свободное самоопределение, вплоть до отделения и образования самостоятельного государства.

3) Отмена всех и всяких национальных и национально-религиозных привилегий и ограничений.

4) Свободное развитие национальных меньшинств и этнографических групп, населяющих территорию России» [1, с. 41].

Менавіта рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. у Расіі адкрылі шырокія магчымасці для разгортвання і арганізацыйна-палітычнага афармлення бела-

рускага нацыянальнага руху, які стаў генератарам ідэі нацыянальнага самавызначэння. Пад уплывам геапалітычнай сітуацыі, якая радыкальна змянілася пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., адбывалася імклівая трансфармацыя ідэі беларускай дзяржаўнасці — ад аўтаноміі да незалежнасці.

У гэты перыяд нацыянальны рух беларусаў, як адзначаў Я. Канчар, набыў «такія памеры, што прайці між іх было нельга і злачынна... Ён перакінуўся на сялянаў, рабочых, асабліва — на салдацкія масы». Зразумела, што найбольш свядомыя прадстаўнікі нацыянальнай эліты Беларусі ў гэты няпросты час як, і лідары іншых краін, імкнуліся здейсніць практычныя захады па стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы. Адзначым, што гэта быў не проста складаны, а нават драматычны перыяд пошуку шляхоў нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення, перыяд спроб і памылак, які разгортваўся ў надзвычай супярэчлівых знешнепалітычных і ўнутрыпалітычных гістарычных абставінах.

Упершыню ідэя стварэння незалежнай нацыянальнай дзяржавы была агучана ў снежні 1917 г. на Першым Усебеларускім з’ездзе (14—18 снежня) у Мінску. У дакументах з’езда, у прыватнасці, адзначалася: «Усебеларускі з’езд, які сабраўся ў Мінску-Беларускім, абмеркаваўшы цяжкае становішча краіны і Беларусі, замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, заваяванае Расійскай рэвалюцыяй, і пацвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі дзеля ахавання цэласнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, пастанавіў вылучыць са свайго Савета орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых дэпутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу» [2, с. 200].

Гэта заява прагучала 17 снежня. Аднак ноччу 18 снежня 1917 г. СНК Заходняй вобласці і фронту распусціў з’езд, члены прэзідыума і шэраг дэлегатаў былі арыштаваныя, але праз некалькі дзён іх адпусцілі на волю. Газета «Советская Правда» ад 21 снежня, тлумачачы прычыны разгону з’езда пісала, што ў яго рашэннях быў «явный и открытый поход против Советской власти под влиянием контрреволюционных кадетов и соглашательских организаций, принимая во внимание, что такое решение и всякая попытка проведения его в жизнь может нанести ущерб делу революции на Западном фронте, Совет Народных Комиссаров Западной обл. и фронта постановил:

Так называемый «белорусский съезд» объявить распущенным и принять меры к ликвидации вновь возникающей контрреволюционной авантюры выступивших под маской белорусских националистов, кадетов, соглашателей» [3]. Дарэчы, дэкрэт аб роспуску Усебеларускага з’езда падпісаў К. Ландэр. Я гэта гавару да таго, каб падкрэсліць, што значная частка лідараў РСДРП не з’яўляліся выхадцамі з Беларусі (Мяснікоў, Ландэр, Крыленка, Берсан, Калмановіч). Яны не былі знаёмыя з мясцовымі традыцыямі і прымалі рашэнні ў адпаведнасці з указаннямі Масквы.

Дэлегаты, што засталіся на волі, на нелегальным пасяджэнні 18 снежня перадалі ўладу Радзе Усебеларускага з’езда. З ліку прадстаўнікоў Рады 21 снежня быў сфарміраваны Выканаўчы камітэт у складзе 10 чалавек як цэнтр кансалідацыі антысавецкіх і антыбальшавіцкіх сілаў у Беларусі, на чале якога быў абраны І. Серада.

Ужо 21 лютага 1918 г. Выканаўчы камітэт Усебеларускага з’езда звярнуўся да народа Беларусі з першай Устаноўчай граматай, у якой падкрэслівалася, што

«беларускі народ павінен зьдзейсьніць сваё права на поўнае самаазначэньне, а нацыянальныя меншасьці на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію» [4, с. 249].

Ідэі незалежнасці значна ўзмацніліся пасля падпісання ў Брэст-Літоўску 3 сакавіка 1918 г. мірнай дамовы Расіі з Германіяй, па якой заходнія беларускія землі перадаваліся Германіі, а паўднёвыя адыходзілі Украіне. Ужо 9 сакавіка 1918 г. Выканкам Усебеларускага з'езда прыняў другую Устаўную грамату, у якой Беларусь абвяшчалася ў межах рассялення беларусаў. І нарэшце, 25 сакавіка 1918 г. была прынята трэцяя Устаўная грамата, у якой Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай у складзе Магілеўскай, Мінскай, а таксама беларускіх частак Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і сумежных губерняў.

З абвяшчэннем 25 сакавіка 1918 г. незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, па сутнасці, упершыню за ўсю гісторыю існавання беларускага народа была не толькі сфармуляваная ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці, але і прыняты практычныя меры па яе рэалізацыі. Былі зроблены першыя практычныя крокі па арганізацыі гандлю, распрацаваны комплекс мер, накіраваных на стварэнне ўласнай фінансава-крэдытнай сістэмы. Народным Сакратарыятам праводзілася рэгістрацыя беларускіх грамадзян, якім выдаваліся адпаведныя пасведчанні, а з лета 1918 г. быў уведзены агульнаграмадзянскі пашпарт БНР. Былі прыняты атрыбуты дзяржаўнасці: герб, сцяг, дзяржаўная пячатка. Найбольш значных поспехаў Народны Сакратарыят дасягнуў у галіне культурна-асветніцкай дзейнасці. Немалаважным з'яўляецца тое, што ў грамадскай свядомасці паступова замацоўвалася ідэя беларускай нацыянальнай дзяржаўнай незалежнасці.

Як бачым, рашэнне задачы нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа было абумоўлена шэрагам абставін аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару. Па-першае, знаходзячыся на важным геапалітычным скрыжаванні Еўропы, Беларусь, неаднаразова станавілася арэнай узброенага процістаяння. Яшчэ з лета — восені 1915 г. Беларусь, апынуўшыся на стыку геапалітычных інтарэсаў і ваенна-палітычных памкненняў дзвюх імперый (Германскай і Расійскай), была «разрэзана» лініяй расійска-германскага фронту. Тэрыторя Беларусі амаль тры гады з'яўлялася тэатрам ваенных дзеянняў, прыфрантавой зонай і тылавым раёнам для супрацьлеглых бакоў. Звыш 2 млн чалавек былі вымушаныя пакінуць родныя мясціны ў выніку ваенных падзей Першай сусветнай вайны. Агульныя чалавечыя страты Беларусі ў 1914—1921 гг. перавысілі 1,5 млн чалавек.

Па-другое, заключэнне Брэсцкага міру паміж Расіяй і Германіяй з саюзнікамі, падпісанага 3 сакавіка 1918 г. у Брэст-Літоўску, значна ўскладніла вырашэнне пытання дзяржаўнага будаўніцтва.

Па-трэцяе, стварэнню нацыянальнай дзяржавы не спрыяла раз'яднанасць палітычных сіл Беларусі, а таксама недастатковая падтрымка з боку шырокай масы насельніцтва тых ідэй, якія вылучаліся рознымі палітычнымі лідарамі. Адзначым, што ў перыяд 1917—1925 гг. у Беларусі дзейнічала 22 партыі. З іх 9 былі нацыянальнымі, 3 — буржуазнымі, 6 — дробнабуржуазнымі і 4 — сацыялістычнымі.

Вядома, у тых няпростых абставінах Беларуская Народная Рэспубліка не магла адбыцца як суверэнная дзяржава. Аднак гэта не з'яўляецца падста-

вай для адмаўлення гістарычнага значэння БНР наогул. Абвяшчэнне БНР сведчыла аб тым, што ў Беларусі сфарміравалася нацыянальная палітычная эліта, якая не толькі здолела выпрацаваць ідэю беларускай дзяржаўнасці, але і разгарнула дзейнасць па яе рэалізацыі на практыцы. Больш таго, абвяшчэнне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці стала важнай палітычнай падзеяй у гісторыі беларускага народа. Менавіта гэты вопыт быў выкарастаны ў перыяды заснавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і будаўніцтва суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Неабходна нагадаць, што ў цяперашні час у нашай краіне праводзіцца значная праца па вывучэнні і захаванні ў нацыянальнай памяці вытокаў фарміравання беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Сённяшні форум — яскравае сведчанне таму. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці — гэта не толькі важнейшая крыніца фарміравання гістарычнага светапогляду народа, але і аснова ўмацавання грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў падрастаючага пакалення.

Як бачна, нават наш рэтраспектыўны погляд на гісторыю беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці дазваляе сцвярджаць, што Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя 1917 г., якія б негатыўныя ацэнкі не імкнуліся даваць сённяшнія паліттэхнолагі і абнаўленцы, назаўжды застанецца адной з найбольш значных падзей не толькі XX стагоддзя, але і ўсёй сусветнай гісторыі. Пры ўсім разыходжанні поглядаў і ацэнак падзеі стогадовай даўніны не дазваляюць нам адмаўляць той факт, што яны аказалі мабілізуючае ўздзеянне на кансалідацыю нацыянальна-вызваленчых сіл, асабліва на ўскраінах Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Беларусі, што прывяло да кансалідацыі нацыянальнай палітычнай эліты і стварэння незалежных дзяржаў.

З усёй відавочнасцю можна канстатаваць і той факт, што рэвалюцыйнае разбурэнне грамадска-палітычнай сістэмы развіцця Расіі паклала пачатак новаму глабальнаму праекту цывілізацыйнага маштабу. Гэта была яшчэ адна спроба экстрэмісцкім шляхам змяніць аб'ектыўны гістарычны працэс развіцця не толькі Расіі, але і ўсёй сусветнай цывілізацыі.

Гістарычны вопыт пераканаўча пацвярджае, што шляхам рэвалюцый і гвалту немагчыма пабудаваць на зямлі грамадства справядлівасці, роўнасці і братэрства. Вядома, што воляй чалавека нельга адмяніць і змяніць ні законы фізікі, ні заканамернасці развіцця грамадства.

Нагадаю, што за ўсю гісторыю ў свеце адбылося 14,5 тысяч войнаў, паўстанняў і рэвалюцый, якія ў той ці іншай ступені былі накіраваны, як уяўлялася іх ініцыятарам і натхняльнікам, на ўдасканаленне і выпраўленне заганаў грамадскага быцця. У выніку было знішчана больш за 6 мільярдаў чалавек, што адпавядала колькасці насельніцтва нашай планеты ў канцы XX стагоддзя. Аднак гэты інструментарый жорсткасці і гвалту над аб'ектыўнымі працэсамі грамадскага развіцця не пазбавіў чалавецтва ад заганаў. Увесь гістарычны вопыт пераканаўча пацвярджае праведнасць слоў, напісаных у вечнай кнізе: «Усякае царства, раздзеленае самое супраць сябе, запусцее; і ўсякі горад або дом, раздзелены сам супраць сябе, не ўстаіць» [5, с. 27].

Давайце не толькі ўслухоўвацца ў мудрасць гэтых слоў, але і рабіць усё магчымае, што залежыць ад кожнага з нас, каб грамадста станавілася больш справядлівым, а адвечныя каштоўнасці людзей: свабода, справядлівасць, дабро, братэрства, — авалодалі думамі народаў.

На жаль, сусветная супольнасць не адмовілася ад тэрарызму, узброеных канфліктаў, рэвалюцый і войнаў. Наадварот, сёння ў розных частках свету новыя палітідэолагі і паліттэхнолагі актыўна навязваюць ідэі так званых «каляровых рэвалюцый». Гісторыя пераканаўча сведчыць, што ідэі палітычных абнаўленцаў не здольны пазбавіць людзей ад праблем. Яны толькі перарываюць, адкідваюць назад аб'ектыўны працэс развіцця грамадства і памнажаюць трагедыі народаў.

Сёння архіактуальнай задачай з'яўляецца процістаянне экстрэмізму ва ўсіх яго праявах. Неабходна актыўна распаўсюджваць ідэі дабра, братэрства, справядлівасці ў грамадскай свядомасці, асабліва ў асяроддзі падрастаючага пакалення, каб пазбавіць экстрэмізм сацыяльнай падтрымкі.

**Шаноўныя калегі!**

Упэўнены, што выказаныя на нашым форуме ацэнкі і ідэі накіраваны ў будучыню развіцця беларускага грамадства. Вядома, што дакладнасць прадбачання вызначаецца перш за ўсё тым, наколькі глыбока і ўсебакова мы вывучаем мінулы вопыт, сучасны стан і заканамернасці змены грамадскага развіцця. Без засваення гэтых фундаментальных пастулатаў у іх адзінстве, без іх практычнага выкарыстання немагчыма не толькі навуковае прадбачанне, але і будучыня развіцця грамадства.

Перакананы, што толькі прыгажосць, дабрыня і закон здольны выратаваць цывілізацыю ад пагружэння ў бяздзейнасць, заганы і разбурэнне. Любіце і рабіце дабро адзін аднаму!

Дзякуй за увагу!

**Бібліяграфічны спіс**


1. Декреты Советской власти / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Институт истории Академии наук СССР. — М.: Госполитиздат, 1957.
2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: са старажыт. часоў да нашых дзён / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. — [2-е выд., дап.]. — Мінск: Акад. МУС, 2003. — 320 с.
3. Советская Правда. 21 дек. 1917.
4. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч і інш. — Выд. 2-е, дапоўненае. — Мінск, 2005. — 432, [6] с.
5. Святое Дабравесце паводле Матфея, 12: 25 // Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста. — Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, Медыял, 2017. — 542, [1] с., [1] л. іл.



**Брыгадзін Пётр Іванавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*


## ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД: ЧАС І АСОБЫ

Лютаўская рэвалюцыя абудзіла нацыянальна-вызваленчы рух на прасторах Расійскай імперыі. Часовы ўрад аб'явіў аб роўнасці грамадзян незалежна ад іх саслоўнай, рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасці. Скасоўваліся абмежаванні адносна месцаў пражывання, паступлення на дзяржаўную вайсковую службу, у навучальныя ўстановы. Была пацверджана аўтаномія Фінляндыі, выказана прапанова аднаўлення незалежнасці Польшчы.Адносна